**ХАЦКЕВІЧ Святлана Сяргееўна.** Нарадзілася 8 верасня 1952 г. у в. Доўгая Дуброва Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Беларуска. Скончыла факультэт фізічнага выхавання Брэсцкага педінстытута па спецыяльнасці "Фізічнае выхаванне" з наданнем кваліфікацыі "Настаўнік фізічнага выхавання" (1973). Працавала асістэнтам кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання (з 1973 г.), кафедры спартыўных дысцыплін (з 1974 г.), кафедры фізічнага выхавання (з 1987 г.) БрДПІ. У 1994–2013 гг. – старшы выкладчык кафедры фізічнай культуры БрДУ. Майстар спорту СССР. Аўтар 50 навуковых, вучэбна-метадычных, навукова-папулярных публікацый.

***Літаратура пра выкладчыка:*** Прафесарска-выкладчыцкі склад Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна : біябібліягр. давед. Брэст, 2005.